VI фестываль хрысціянскай музыкі

Аўтар: паводле grodnensis.by
01.01.2017 00:00

VI фестываль хрысціянскай музыкі “Дастукацца да нябёсаў” пройдзе ў Баранавічах

Трохгадзінны канцэрт адбудзецца **11 лютага** ў Доме культуры тэкстыльшчыкаў. **Пача так у 19.00.**

Тэмай сёлетняга фестывалю стануць словы
“Каб усе былі адно”.

Упершыню фестываль адбыўся ў Астраўцы ў студзені 2012 года як рок-фестываль рэлігійнай песні. Затым – у Гудагаі. Апошнія 3 гады фестываль праходзіць у Баранавічах. За гэты час на сцэне выступалі такія гурты, як “AVE” (г. Гродна), “The Cross Way” (г. Баранавічы), “United in Spirit” (г. Баранавічы), “Laudans” (г. Мінск), “Небасхіл” (г. Мінск) і іншыя.

 Арганізатары абяцаюць гасцям шмат прыемных сюрпрызаў. Уваход бясплатны.